А.В. ДЗЯБЁЛАЯ

АКАЗІЯНАЛЬНЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ Ў МАСТАЦКАЙ ПРОЗЕ

Рассматриваются окказиональные фразеологизмы, зафиксированные в белорусской художественной прозе. Анализируются способы их преобразования, роль и место в контексте.

The article deals with occasional phraseological units in Belarusian artistic prose. The occasional changes of the phraseological units and their interrelations with the context are analyzed.

Праблема пераўтварэння фразеалагічных адзінак (ФА) з'яўляецца адной з самых важных у фразеалогіі, таму што звязана з акрэсліваннем межаў вар'іравання фразеалагізмаў, з вызначэннем тоеснасці семантыкі моўных адзінак пры іх знешніх зменах, з выяўленнем месца індывідуальна-аўтарскіх фразеалагічных неалагізмаў у сістэме мовы і маўлення. Агульнапрынятай лічыцца думка, што практычна кожная ФА можа вар'іравацца і мець тыя ці іншыя мадыфікацыі. Шматлікія выпадкі індывідуальна-аўтарскіх пераўтварэнняў фразеалагізмаў разглядалі і аналізавалі многія фразеолагі (М.М. Шанскі, Л.І. Райзензон, І.В. Дубінскі, Э.І. Тарханава, Я.А. Маліноўскі, С.К. Берднік, Т.М. Трыпуціна, М.Р. Каваленка, Ф.М. Янкоўскі, А.С. Аксамітаў, А.М. Шубадзёрава, І.Я. Лепешаў і інш.), таму існуюць самыя розныя колькасныя паказчыкі аўтарскіх мадыфікацый устойлівых выразаў і неаднастайныя азначэнні спосабаў змянення ФА. Традыцыйна ўсе змены фразем зводзяцца да агульнамоўных (унутрысістэмных) і маўленчых (індывідуаль-на-аўтарскіх). Мы падзяляем розныя тыпы пераўтварэнняў ФА на узуальныя варыянты і аказіянальныя мадыфікацыі фразем. Аказіянальнае ўжыванне фразем адзначаецца ў тых выпадках, калі структурныя ці семантычныя змены фразеалагізмаў адбываюцца ва ўмовах пэўнага кантэксту і з'яўляюцца індывідуальнымі.

Аказіянальнасць, па вызначэнні Эр. Ханпіра, «ёсць вядомая ступень незададзенасці маўленчага факта сістэмай мовы, што стварае пэўную ступень нечаканасці такога факта для моўнай сістэмы»* (Ханпира 1972, 246). **Аказіянальным** можна лічыць такі фразеалагізм, які ствараецца па мадэлі ўжо вядомага (узуальнага) і ў якім адчуваецца ўнутраная сувязь з зыходнай формам (сэнсавая і структурная). Можна назваць наступныя вызначальныя рысы аказіянальных ФА: 1) вылучэнне іх на ўзроўні маўлення, а не мовы; 2) першапачатковая неўзнаўляльнасць індывідуальна-аўтарскіх фразем, якія з'яўляюцца вынікам творчай дзейнасці тага ці іншага пісьменніка; 3) ненарматыўнасць на ўзроўні літаратурнага узусу. Зразумела, што ўласна аказіянальныя фразеалагізмы - з'ява даволі рэдкая, таму што іх «канструяванне» больш складанае, чым стварэнне новага слова. Хоць кампаненты ФА больш свабодныя, чым састаўныя часткі слова, аднак сувязь з зыходным устойлівым выразам фразеалагічнага наватвора не заўсёды можа лёгка адчувацца чытачамі.

Заўважым, што ў беларускай мастацкай прозе 60-90-х гг. XX ст. колькасць аўтарскіх фразеалагічных наватвораў нязначная (0,8 %). Найчасцей сустракаюцца выпадкі **аказіянальнага ўжывання** ФА, узнікшыя ў выніку разнастайных мадыфікацый узуальных фразем, якія выкарыстаны ў незвычайных кантэкстах ці выявілі нетыповую спалучальнасць. Толькі ў кантэксце выяўляюцца тыя мастацкія эфекты, што закладваюцца аўтарам у структуру і змест фразем, асабліва трансфармаваных. А спецыфічнасць мастацкага кантэксту заключаецца ў тым, што ён «абавязкова суб'ектыўна арганізаваны, асобасна маркіраваны, і таму моўная карціна свету ў ім непазбежна трансфармуецца» (Кривецкая 2006, 13).

Значна ўзрастае роля кантэксту пры выкарыстанні пісьменнікамі некадыфікаваных, скалькаваных ФА. Напрыклад: *Алесю Юр'евічу з вамі*

---

* Тут і далей пераклад аўтара. - *А. Д.*

пашанцавала. ***Са срэбнай лыжкай у роце нарадзіўся*** (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Сэнс не зафіксаванага ў беларускіх слоўніках фразеалагізма ***нарадзіцца са срэбнай лыжкай у роце*** 'быць шчаслівым, удачлівым', які ўзнік у выніку літаральнага перакладу з англійскай мовы ўстойлівага выразу be born with a silver spoon in on's mouth, прадвызначаецца ўжываннем у кантэксце лексемы *пашанцавала.*

Тэрмін **кантэкст** мае шмат вызначэнняў у лінгвістычнай літаратуры. Мы прытрымліваемся азначэння, дадзенага А.Я. Міхневічам: «Пад кантэкстам разумеюць закончены ўрывак вуснага ці пісьмовага тэксту, які дазваляе вызначыць сэнс слова або выразу, што ўваходзіць у гэты ўрывак» (Міхневіч 1994, 249). Будаўнічым матэрыялам для сказаў з'яўляюцца нароўні са словамі і фразеалагізмы, якія шляхам дапасавання, кіравання ці прымыкання звязваюцца са словамі, утвараючы так званы «фразеалагічны кантэкст» (гл. Жуков 1967, 40). Некаторыя даследчыкі ў сваю чаргу размяжоўваюць моўны і маўленчы фразеалагічны кантэкст (гл. Добрыднева 2000, 96).

Менавіта з дапамогай кантэксту вызначаецца сэнсавая напоўненасць полісемантычных фразем. Напрыклад, фразеалагізм *хоць ваўкоў ганяй* у залежнасці ад тэкставага акружэння выяўляе значэнні: 1) 'вельмі холадна' (у хаце, у памяшканні): *У хаце была халадэча, як у лядоўні, -* ***хоць ваўкоў ганяй*** (Л. Левановіч. Ларыса, альбо Прыгоды аўтамабіліста); 2) 'вельмі вялікі' (пакой): *У мяне, брат, дом -* ***ваўкоў ганяй*** (І. Пташнікаў. Сцяпан жыхар са Сцешыц).

Пазіцыя фразеалагічнай адзінкі, яе значэнне выяўляюцца толькі ў кантэксце. Адметнасці выкарыстання фразеалагізмаў у складзе пэўных сінтаксічных канструкцый вызначаюцца ў аказіянальных (інверсійных, ненарматыўных) і узуальных (нарматыўных, тыповых, заканамерных) пазіцыях.

У творах сучасных беларускіх празаікаў выяўляюцца наступныя «пазіцыйныя варыянты ФА» (гл. Гашева 1999):

- прэпазіцыя - выкарыстанне ФА ў пачатку сказа - складае каля 13,2 % ад агульнай колькасці фразеаўжыванняў: ***Макаваму зярняці няма дзе ўпасці*** *- скрозь машыны, танкі, фурманкі* (А. Кулакоўскі. Маршрут ад Клічава);
- інтэрпазіцыя - ФА ў сярэдзіне сказа - выяўляецца ў 28,6 % прааналізаваных фразеаўжыванняў: *Забеспячэнне -* ***ахілесава пята*** *ўсёй нашай эканомікі* (І. Макаловіч. Версія капітана Барташа);
- пераважнай большасці (каля 53%) фразеалагізмаў уласціва постпазіцыя - ФА знаходзяцца ў канцы прэдыкатыўнай часткі складанага сказа ці ў канцы любога тыпу сказа: *Алесь імчаў, як кажуць,* ***на ўсіх парусах:*** *стрэлка спідометра вагалася недзе каля лічбы "100"* (І. Сіняўскі. А вяселля не было); *Былі сярод паляўнічых людзі зусім маладыя, нават юнакі, а былі і такія, пра якіх кажуць -* ***панёс косці на вецер*** (К. Кірэенка. Віна);
- нешматлікія прыклады прэпостпазіцыі кампанентаў фразеалагізмаў назіраюцца пры дыстантным іх ужыванні: *Вынайшоў і яшчэ спосаб.* ***Спяваць*** *патрэбнаму чалавеку* ***дыфірамбы*** (У. Паўлаў. Сотая маладосць); ***Пальцам аб палец*** *на ўмацаваннях* ***не стукнулі*** (У. Караткевіч. Хрыстос прызямліўся ў Гародні);
- інтэрпостпазіцыя (адзін з кампанентаў ФА займае сярэдзіну сказа, **а** другі - знаходзіцца ў канцы) у мастацкіх кантэкстах не вызначаецца частотнасцю і складае менш як 1 % ад усіх фразеаўжыванняў: *- А вы не бачылі - што я* ***на галаву*** *за ўсіх* ***вышэй?*** (К. Кірэенка. Баравікі з Кургання); .../ *гаварыў абы-што,* ***збіраў,*** *як кажуць,* ***мох з балота*** (І. Сіняўскі. А вяселля не было).

Акрамя пералічаных пазіцыйных варыянтаў, у фразеалогіі існуе паняцце пазіцыйнай аказіянальнасці, якая выяўляецца ў тых кантэкстных умовах, калі адзінка пачынае выступаць у неўласцівым для яе акружэнні, з нетыповай для яе значнасцю (гл. Диброва 1979, 92). Намі заўважана, што пазіцыйная аказіянальнасць найчасцей выяўляецца пры метафарызацыі фразеалагізма ў нетыповым кантэксце. Асаблівай вобразнасцю вызначаюцца фразеалагізмы ў кантэкстах, якія ўзнікаюць у выніку метафарызацыі тыпу «нежывому - жывое»: - *Сейф - дама капрызлівая. З першага знаёмства* ***сэрца не адкрывае.*** *Любіць абыходжанне* (І. Макаловіч. Кіпцюры мафіі). Ужыванне фразеалагізма *сэрца не адкрываць* пры неадушаўлёным суб'екце актуалізуе прамое значэнне адпаведнага свабоднага словазлучэння, у выніку ў прыведзеным урыўку назіраецца пераасэнсаванне ФА. У пераважнай большасці выпадкаў неадушаўлёнасць прадмета не змяняе семантыкі фразеалагізма, а толькі абуджае вобразныя асацыяцыі: *Але <горад на Прыпяці>, як многія падобныя на яго беларускія гарадкі, размешчаныя на рэках, імкліва расце. Дзякуючы, вядома, індустрыялізацыі, што* ***прыбрала*** *да* ***рук*** *многія ціхія гарадкі* (І. Навуменка. Гасцініца над Прыпяццю); *Цяпер, у яркім сонечным святле, яшчэ лепш відаць, што высокі куст бэзу ў агародчыку сапраўды пацярпеў,* ***як той швед пад Палтавай*** *- стаіць абламаны, голы, без адзінага суквецця* (В. Гардзей. Уратуй ад нячыстага).

Увогуле суадносіны ФА і кантэксту - даволі складаная праблема, якая можа разглядацца з розных пазіцый. Асаблівае месца пры разглядзе гэтага пытання займае праблема ірадыяцыі, г. зн. узаемаўплыву фразеалагічнай адзінкі і яе акружэння. У кожным кантэксце лёгка можна вылучыць словы і словазлучэнні, якія суадносяцца з ФА як яе непасрэдныя актуалізатары. Больш складана высветліць узаемадзеянне ФА і семантыкі ўсяго кантэксту, які разглядаецца як адзінае цэлае. З аднаго боку, ФА можа ўплываць на семантычную структуру кантэксту, з другога боку, сам кантэкст можа не толькі прадвызначаць ці, наадварот, адмаўляць з'яўленне ў ім ФА пэўнай семантыкі, але і дэтэрмінаваць форму яе функцыяніравання - узуальную ці аказіянальна пераўтвораную: Але *каб ворагам стаў Заруба, таго Азевіч уявіць не мог. Ды ўсё ж нешта, мабыць, было... Нездарма яго выклікаў Мілаван, цяпер во пра тое ж кажа і Паліна. <...> Паліна знікла на цэлы тыдзень, і Ягор хадзіў* ***нібы апушчаны ў мутную ваду - збіты з панталыку,*** *здзіўлены, нават абураны. Толькі на каго?* (В. Быкаў. Сцюжа). Увядзенне прыметніка 'мутную' ў фразеалагізм *апушчаны ў ваду* абапіраецца на кантэкст: Ягор быў не проста засмучаны, але заблытаны незразумеласцю, «няяснасцю» сітуацыі, якая паўтаралася для многіх у такі смутны час. Фразеалагізм *збіты з панталыку* падкрэслівае збянтэжанасць і разгубленасць галоўнага героя. У гэтым і падобных выпадках кантэкст не толькі дэтэрмінуе аказіянальнае пераўтварэнне ФА, але і вызначае ў пэўнай ступені сам характар аказіянальных змен: прыём увядзення слова ў структуру ФА быццам бы адлюстроўвае прыкмету часу, што «ўкліньваўся» ў жыцці і лёсы людзей.

Яшчэ адна тэндэнцыя ў суадносінах ФА і кантэксту: у параўнальна невялікім фрагменце мастацкага твора ўжываецца некалькі фразем, заўважаецца «фразеанабор»: *Змоладу б'ешся* ***як рыба аб лёд,*** *пакуль вас, дзяцей,* ***на ногі паставіш, у людзі выведзеш*** (Б. Сачанка. Непаваротлівы пухнаты чмель). У такім выпадку можна гаварыць пра фразеалагізацыю кантэксту, у якім назіраецца ампліфікацыя ФА. Выкарыстанне некалькіх ФА стварае эфект узмацнення экспрэсіўнай, эмацыянальнай насычанасці кантэксту, які набывае «фразеалагічную» афарбоўку: - *Жабоцька! - са злосцю вымавіў Сцяпан. -* ***Матчына малако на губах не абсохла, а нос задзірае - аглобляй не дастаць*** (І. Сіняўскі. Князёк).

Такім чынам, менавіта ў кантэксце адбываецца канкрэтызацыя значэння фразеалагізма і рэалізуюцца разнастайныя трансфармацыі фразем, абумоўленыя творчай задумай пісьменніка. У творах сучасных беларускіх празаікаў выяўляюцца і структурна-семантычныя, і семантычныя пераўтварэнні ФА: марфемнае абнаўленне кампанента фразеалагізма, замена кампанента, змена катэгарыяльнага значэння, фразеалагічная зеўгма, фразеалагічная алюзія і інш. Сярод найбольш эфектыўных прыёмаў абнаўлення ФА вылучаецца **ўтварэнне аказіянальных фразеалагізмаў па аналогіі з узуальнымі.** Структурна-семантычны ўзор, які з'явіўся асновай утварэння новага фразеалагізма, можа падавацца ў кантэксце і, як правіла, узначальваць бінарны рад аднародных ФА: *Што й гаварыць, у кватэры без Пашы лепей і не заставацца: адзінота, глушыня такая - **хоць воўкам вый, хоць савой кугакай,** ніхто не пачуе, сядзіш, быдта ў копанцы якой, усімі забытая, непатрэбная* (А. Масарэнка. Пакуль не завялі кветкі). У большасці выпадкаў першааснова аказіянальных ФА лёгка аднаўляецца і таму аўтарамі не згадваецца: *Будзе як сынок: **ні цёплы ні халодны*** /ні рыба ні мяса/ (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Раптам на яго якісь мамэнт надыдзе, пачне са мной сварыцца і **палено з плотам*** /боб з гарохам/ *змяшае* (А. Карпюк. Карані); ***Як у пельку боўтнуў*** /як у ваду кануў/, / *знаку няма* (С. Грахоўскі. Рудабельская рэспубліка); - *А нам зноў **хрэн з соллю*** /дуля з макам/ *застануцца: хочаш - еш, хочаш - душыся* (Т. Бондар. Ахвяры); - *А што ў цябе ёсць? - пытаецца маці. - Не «чаму»? «што»? «як»?, а адразу **каня за аброць*** /браць быка за рогі/ (А. Кудравец. Песня).

Сінанімічны рад выразаў з агульным значэннем 'зусім не, нікольки не (патрэбны хто-небудзь, што-небудзь)', які складаецца з узуальных ФА *як рыбе парасон, як у мосце дзірка, як сабаку пятая нага* і інш., увесь час папаўняецца новымі, сітуацыйна абумоўленымі выразамі: *Мне і айцу майму ўсё гэта патрэбна, **як дзесятая дзірка ў целе*** (У. Караткевіч. Хрыстос прызямліўся ў Гародні); - *Патрэбна мне тая экскурсія, **як папу гармошка,** але настаўнікі...* (У. Глушакоў. Расплата); - *Чурбак ты, Сэм. Не спасцігаеш жаночай натуры, - Валя прытворна ўздыхнула. - Патрэбны вы нам **як** зайцу **праязны білет на метро*** (У. Шыцік. Камандзіроўка ў сваім горадзе) і пад. Гаворачы пра вялікую колькасць чаго-небудзь, напрыклад ягад, грыбоў, ужываюць фраземы *хоць касой касі, хоць вазамі вазі,* з тым жа значэннем, але ў адносінах да грошай, выкарыстоўваецца выраз *хоць мятлой мяці: Ды і ў Мілым сядзець не так ужо і дрэнна. Толькі што пашаны менш, але бог ужо з ёю, з пашанай, калі грошай - **хоць мятлою** мяці* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Па той жа структурнай мадэлі ўтвараецца ФА *хоць вушамі еш: «Няўжо трэба стаяць па чайнікі абавязкова ў Гомелі, калі іх **хоць вушамі еш** у Лядах?..»* (Г. Марчук. Пагарэльцы).

Аказіянальныя выразы, супрацьлеглыя па значэнні ўжо вядомым на агульнамоўным узроўні ФА, найчасцей утвараюцца шляхам замены кампанента узуальнага фразеалагізма антанімічным: *Хто пра іх паклапоціцца? Паны? Ды яны **апошнюю сарочку з цябе здзяруць*** /параўн.: апошнюю сарочку аддасць/, *апошні кавалак хлеба з рота вырвуць* (А. Якімовіч. Канец сервітуту); *Нарэшце ты збіў **аскоміну*** /параўн.: набіць аскоміну/ /, *здзіўлены прыемнай нечаканасцю, вырашаеш зняцца з якара і браць курс на прыстань* (Я. Пархута. Там, дзе жыве Юлька). Пры ўтварэнні новага фразеалагізма шляхам замены кампанентаў можа мяняцца яго структурная мадэль (напрыклад, ФА са структурай абагульнена-асабовага сказа можа ператварацца ў безасабовы) і значэнне: *Такому не толькі скоблі - **снегу зімой не варта даваць...*** /параўн.: снегу леташняга не дапросішся/ (І. Сіняўскі. Далёкае рэха).

У творах беларускіх пісьменнікаў нярэдка выяўляецца адначасовае ўжыванне некалькіх тыпаў пераўтварэнняў фразеалагізмаў:

• змена катэгарыяльнага значэння і разгортванне метафарычнага кантэксту на аснове ФА: *Усе **кінутыя ў агарод** Аньчо **каменьчыкі*** /кідаць каменьчыкі ў агарод/ *траплялі ў сэрца Сцёпку, і яно то соладка замірала (прынцэса на гарошыне... ну, вядома, прынцэса!), то балюча сціскалася (галыцьба няшчасная)* (М. Філіповіч. Клетка для каханай);

• змена катэгарыяльнага значэння з адначасовым увядзеннем слова свабоднага ўжывання ў структуру ФА: *- А ў цябе ўсё няправільна, Аляксей, - азваўся Усцігаў. - Чаму? - Відаць, **у гарачай вадзе маленькага купалі*** /у гарачай вадзе купаны/ *ці на чаране нарадзіўся* (С. Грахоўскі. Ранні снег);

• кантамінацыя фразеалагізмаў, спалучаная з ускладненнем ФА словам свабоднага ўжывання і заменай кампанента: *- І я абяцаю табе, Пракопавіч, што я **ўдзяўбу** гэта ў тваю **вялікую і светлую галаву,** хіба жыў не буду* /убіваць у галаву + светлая галава/ (У. Дамашэвіч. Кожны чацвёрты);

• замена кампанента і метафарызацыя фразеалагізма ў нетыповым кантэксце: *Вы мне растлумачце, калі і як пачалося, што **паднялі вушы*** /паднялі галаву/ *зайздрасць, недавер'е, знявага?* (Г. Марчук. Паляшук);

• замена кампанента і пашырэнне кампанентнага складу ФА: *Памятайце: з ксяндзом трымайцеся натуральна, з асцярогай і сур'ёзна, бо ён на лоўлі душ **не аднаго сабаку згрыз*** /сабаку з'еў/ (М. Віж. Лабірынт); *І яшчэ **з дзесятак шпілек сыпанулі** слухачы дакладчыку, у якога, відаць, былі цвёрдыя намеры зачытаць на валасным сходзе гэтыя важныя для рады дакументы і дабіцца, каб іх ухвалілі* /падпускаць (падпусціць) шпільку (-і)/ (А. Якімовіч. Цяжкі год);

• марфемнае абнаўленне і пашырэнне кампанентнага складу: *- Лебедзеў прынцэсу Люську не вельмі шануе. Гэта дамачка можа **накласці** на рэчы сваю **наманікюраную лапку*** /накласці лапу/ (У. Шыцік. Камандзіроўка ў сваім горадзе);

• утварэнне аказіянальнай ФА па аналогіі з узуальнай і канкрэтызацыя значэння фразеалагічнага кампанента: *- Калі мяне з наркамата, палячыўшы ў санаторыі, паслалі на спіртзавод, некаторыя зайздросцілі: **пусцілі шчупака ў раку.** Але які я **шчупак!** Нават не акунёк. Плотачка* (І. Шамякін. Драма).

Дапушчальнасць адначасовага камбінаванага ўжывання некалькіх прыёмаў мадыфікацыі ФА стварае практычна неабмежаваныя магчымасці творчага выкарыстання, разнастайных пераўтварэнняў фразем у маўленні.

Колькасць уласна індывідуальна-аўтарскіх фразеалагізмаў, выяўленых у прозе 1960-1990-х гг., нязначная. Але яны вызначаюцца арыгінальнасцю і непаўторнасцю: *У душы ён зноў не быў згодны з Ваўчэцкім, але пярэчыць увесь час было ўжо звыш усякай меры, дзіўна яшчэ, як Ваўчэцкі цярпеў яго дагэтуль, не **паслаў** яго **да бога ў прэм'ер-міністры*** (У. Дамашэвіч. Кожны чацвёрты); *- Прыпазнілася твая мосць, адказваю, - а то б **ужо праз твае рэбры авечкі сена цягалі*** (У. Арлоў. Міласць князя Гераніма). Частотнасцю вызначаюцца фразеалагічныя наватворы, якія ўдакладняюць акалічнасць *туды* і маюць значэнне 'вельмі далека', 'у далёкую ссылку': *- Ты тут не вельмі выбрыквай. Ніхто з табою цацкацца не будзе. Адправяць туды, **дзе нават белы мядзведзь не зімуе*** (З. Дудзюк. Мастацтва забіваць); *А як ён 20 год нязменна хадзіў у ганаровых суддзях, і да раздзелу і пасля, у губернскім земскім судзе, то намерыўся ўпячы злачынцу, **адкуль і крумкач костак не прыносіў;** .../ чаму таго, хахла, што вершы пісаў, загналі туды, **дзе бабы бялізну на вясёлку сушыцца вешаюць*** (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Увесь час папаўняюцца

новымі выразамі шматкампанентыя сінанімічныя рады фразеалагізмаў, што маюць значэнне 'вельмі мала': *Губа здзекліва глядзеў на яго: «Чаго мне баяцца! Мне ўсяго жыцця* ***з вераб'іныя нагавіцы»;*** *Край як парахавая бочка, а прыбытку з яго -* ***каціныя слёзы*** (У. Караткевіч); і 'вельмі многа': - *Назапрашалі, разумеет* ***мамаеву арду*** *гасцей, а іх усіх накарміць-напаіць трэба* (М. Герчык. Вяртанне да сябе); *Дзяцей, канечне, ды маладых не трэба і гнаць, іх у клубе* ***лыжкай не памяшаеш,*** *яны толькі радыя, а жанчыны брылі як на пакаранне* (М. Кусянкоў. Явар з калінаю). У асобную групу можна вылучыць аказіянальныя ФА, якія характарызуюць асобу, падкрэсліваючы станоўчыя ці адмоўныя якасці: *Фастар з яго быў нявопытны, але рухавы і, галоўнае, бездакорна сумленны,* ***капейкі пад ногаць не зацісне*** (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Генадзь Васільевіч* ***мог*** *бы дастаць не толькі рэдкі японскі імпульсны лічыльнік, а нават* ***злізаць вяршкі з Млечнага Шляху*** (М. Герчык. Вяртанне да сябе); *Штось не так -* ***вады прамытае не дасць*** (Ф. Янкоўскі. Каб у рожкі...); - /*чалавек вельмі харошы. І кнігі любіць дужа. Толькі вось адно ў яго гора -* ***кніжку ў шкляной вокладцы любіць часам пагаршаць*** (А. Савіцкі. І нічога ўзамен).

Разгледжаныя выразы, утвораныя на аснове аўтарскіх метафар, з'яўляюцца патэнцыяльнымі ФА, яны «не могуць быць уключанымі ў фразеалагічны слоўнік літаратурнай мовы да тага часу, пакуль не з'явяцца хоць бы адзінкавыя пацвярджэнні іх ужывання ў мастацкіх, публіцыстычных і іншых беларускіх тэкстах» (Лепешаў 2002, 134). Нават пададзеныя ў мастацкай прозе фразеалагізмы могуць адлюстроўваць асаблівасці народнага маўлення: *Кепско, сынок,* ***на чужой бородзе брыцца*** (У. Глушакоў. Расплата). Таму, на нашу думку, адзінкавых фактаў ужывання падобных фразеалагізмаў у пісьмовых крыніцах відавочна недастаткова, толькі пры неаднаразовым іх ужыванні ў творах розных пісьменнікаў яны могуць стаць устойлівымі і ўзнаўляльнымі.

Такім чынам, у мастацкім кантэксце выяўляюцца разнастайныя пазіцый-ныя варыянты ФА, у тым ліку назіраецца і пазіцыйная аказіянальнасць. Індывідуальна-аўтарскія змены фразеалагізмаў выконваюць мастацка-выяўленчыя функцыі толькі ў кантэксце, па-за кантэкстам яны становяцца бессэнсоўнымі. Уласна аказіянальныя ўстойлівыя выразы з'яўляюцца патэнцыяльнымі фразеалагізмамі пры ўмове іх фіксацыі не толькі ў маўленчым, але і ў моўным узусе.

ЛІТАРАТУРА

Гашева Л.П. Позиции процессуальных фразеологизмов в предложении: Автореф. дис.... д-ра филол. наук. Волгоград, 1999.

Диброва Е.И. Вариантность фразеологических единиц в современном русском языке. Ростов н/Д., 1979.

Добрыднева Е.А. Коммуникативно-прагматическая парадигма русской фразеологии. Волгоград, 2000.

Жуков В. П. Фразеологизм и слово: Автореф. дис.... д-ра филол. наук. Л., 1967.

Кривецкая Е.С. Окказиональная фразеологическая номинация как средство выражения языковой личности автора художественного текста: Автореф. дис. ... канд. филол. наук. Ставрополь, 2006.

Лепешаў І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні. Гродна, 2002.

Міхневіч А.Я. Кантэкст // Беларуская мова: Энцыкл. Мн., 1994.

Ханпира Э. Окказиональные элементы в современной речи // Стилистические исследования (на материале современного русского языка). М., 1972. С. 239-248.

Паступіў у рэдакцыю 13.09.07.

Алена Віктараўна Дзябёлая - выкладчык кафедры беларускага мовазнаўства БрДУ імя А.С. Пушкіна.